# 2023 год

# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

Звесткі з архіва
Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2023 год з’яўляецца юбілейным.*

55 гадоў

**Навуменка, І. Я. Вераніка : Апавяданні / Іван Навуменка; [Уступ. артыкул Ф. Куляшоў]. – Мінск : Народная асвета, 1968. – 168 с.**




Кніга «Вераніка» – гэта зборнік апавяданняў Івана Навуменкі (1925–2006), прысвечаных у асноўным апісанню жыцця школьнікаў у даваенны і ваенны час.

Кніга здадзена ў набор 29 снежня 1967 года, а падпісана да друку 11 красавіка 1968 года. Рэдактар зборніка – беларускі мовазнавец С. М. Грабчыкаў (падчас падрыхтоўкі выдання працаваў у выдавецтве «Народная асвета» старшым рэдактарам).

Мастацкае афармленне выдання выканана вядомым мастаком-графікам В. П. Шаранговічам (братам мастака К. П. Шаранговіча).

Тыраж кнігі – 14 000 экзэмпляраў.

# «Вераніка» : 55 гадоў



Зборнік адкрываецца прадмовай «Рамантыка мары і подзвігу», напісанай Фёдарам Куляшовым, які разам з Іванам Навуменкам працаваў на філфаку БДУ і з’яўляўся загадчыкам кафедры рускай і класічнай літаратуры. Назва зборніку «Вераніка» дадзена па аднайменным гераічным і рамантычным апавяданні, у якім падзеі разгортваюцца перад самай вайной. У дзявяты клас прыйшла новая вучаніца Вераніка Хмялеўская, у якую адразу закахаліся ўсе хлопцы. Сярод усіх прыгажуня выдзеліла Славу Загароўскага, але не для сяброўскіх адносін, а наадварот – для нападак і зневажанняў. Слава плаціў у адказ тым жа. Так у пікіроўках і прайшоў спачатку дзявяты, а потым і дзясяты клас. Усе спробы сяброў прымірыць герояў былі марнымі. А потым пачалася страшная і крывавая вайна. Хлопцы, учарашнія дзесяцікласнікі, пайшлі на фронт. З шаснаццаці вярнуліся толькі шасцёра.

У 1942 годзе фашысты расстралялі Вераніку за тое, што яна друкавала на машынцы лістоўкі. Слава Загароўскі пранёс сваё каханне праз гады. Ён прыходзіць на бераг невялікай рэчкі, дзе пахавана дзяўчына, і «падоўгу ходзіць там і пра нешта думае»...
Акрамя «Веранікі» ў асноўны змест зборніка ўключаны апавяданні «Жуль Верн», «Пераломны ўзрост», «Таніпка», «Па грыбы», «Верасы на выжарынах», «Семнаццатай вясной», «Дом над морам», «Хлопцы-равеснікі», «Настаўнік чарчэння», «Ганьба «святога» Лукі». У анатацыі да зборніка дадзена наступная агульная іх характарыстыка: «Шчырыя і добразычлівыя адносіны аўтара да сваіх юных герояў, глыбокае і тонкае раскрыццё іх псіхалогіі, разуменне іх светлых ідэалаў – усё гэта не толькі хвалюе, але і робіць чытача як бы непасрэдным удзельнікам той падзеі, якая стаіць у цэнтры апавядання. Яркія, па-майстрэрску пададзеныя малюнкі родных мясцін захапляюць чытача, надоўга запамінаюцца і не пакідаюць яго абыякавым да сябе».